**ВАЙЦЮШКЕ́ВІЧ** Дзмітрый Іванавіч (н. 20.7.1971, г. Бярозаўка Лідскага р-на), кампазітар, спявак, мульты-інструменталіст, выканаўца бел. нар. песень і найгрышаў. Скончыў Лідскае (1990) і Мінскае (1995) муз. вучылішчы, Бел. універсітэт культуры (1995). Працаваў у фольк-гуртах *«Палац»* (1992—98), *«Крыві»* (1997—2001), «WZ-Orkiestra»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(«Усход-Захад аркестр»; з 2001, яго стваральнік). Удзельнічаў у праграмах «Народны альбом», «Святы вечар», «Я нарадзіўся тут», «Скрыпка дрыгвы» і інш., а таксама ў супольных міжнародных праектах. Збіраў фальклор у розных рэгіёнах Беларусі, пераважна на Усходнім Палессі і Паазер'і. У рэпертуары бел. нар. песні розных жанраў (каляндарна-абрадавыя, сямейна-абрадавыя, лірычныя і інш.), сярод якіх «А ўчора бабка», «Як пайду я каля лесу», «Ішла Каляда, калядуючы», «Сын Даніла» і інш. Для творчай манеры В. характэрны набліжанасць да аўтэнтычнага выканання, разнастайныя формы эксперыментавання ў вакале і аранжыроўках. Актыўна выкарыстоўвае нар. інструменты (ліра, дуда, гудок і інш.). Запісаў на кампакт-дысках сольныя альбомы: «Цацачная крама» (2001), «Балады» (2002), «Паравіны году» (2003). Лаўрэат шматлікіх міжнародных фестываляў і конкурсаў у Італіі, Францыі, Германіі, Швецыі, Нарвегіі, Польшчы, Эстоніі, Літве, Расіі, Казахстане.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ